УДК 378.4(476.5):73/76:070

# Гісторыя мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава на старонках друку

**_Вінаградаў В. Н._**
_Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", Віцебск_

_У артыкуле прадстаўлены звесткі аб шматлікіх публікацыях, прысвечаных стварэнню ў 1959 годзе і першым гадам працы мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута (універсітэта), што былі змешчаны ў беларускім друку. Прыводзяцца дадзеныя аб прадумовах стварэння ў Віцебску Мастацкага музея, удзеле выкладчыкаў факультэта ў эстэтычным выхаванні моладзі, правядзенні творчых выстаў. Значная ўвага нададзена публікацыям, прысвечаным студэнцкім справам (вынікі экзаменаў, абарона дыпломных работ, арганізацыя выставак і інш)._

Ужо першыя "крокі" ў гісторыі мастацка-графічнага факультэта не толькі выклікалі вялікую цікавасць грамадскасці, знайшлі адлюстраванне уў рэспубліканскім і абласным друку, але і прадэманстравалі значнасць і высокую запатрабаванасць спецыялістаў, падрыхтоўкай якіх займаўся гэты факультэт. Сродкі масавай інфармацыі звярнулі ўвагу і на факт актывізацыі творчай дзейнасці ў Віцебску, на з'яўленне новай плеяды маладых творцаў, якія ў далейшым сталі сапраўдным гонарам славутай Віцебскай мастацкай школы. Прыкметна, што аўтар гэтага артыкула не толькі аказаўся адным з арганізатараў, заснавальнікаў мастацка-графічнага факультэта, але і прыклаў у канцы 1950 – пачатку 60-х гадоў вялікія намаганні, ужо як журналіст і навукоўца для папулярызацыі яго дзейнасці.

**_Ключавыя словы:_** _мастацка-графічны факультэт, чарчэнне, маляванне, творчая выстава, мастак-педагог, графіка, выкладчык, студэнт, дыпломная работа._

# History of the Art Faculty of Vitebsk State P.M. Masherov University in Mass Media

**Vinagradau V. N.**
_Educational Establishment "Vitebsk Sate P. M. Masherov University", Vitebsk_

_Data of numerous Belarusian newspaper articles which dwell upon the foundation (in 1959) and first years of work of the Art Faculty of Vitebsk Pedagogical Institute (University) are presented in the article. The preconditions of establishing the Art Museum of Vitebsk, participation of the Faculty teachers in aesthetic upbringing of youth, conducting artistic exhibitions are shown. Considerable attention is drawn to articles on student affairs – exam results, diploma paper defense, setting out exhibitions etc._

_First "steps" in the Art Faculty history were not only extremely interesting for the public, found reflection in the Republic and Region mass media but also demonstrated the significance and demand in specialists who the Faculty trained. Mass media also paid attention to the fact of the intensification of artistic activities in Vitebk, to the emergence of a number of young artists who later became the honour of the famous Vitebsk art school. It should be pointed out that the author of the article was not only one of the founders of the Art Faculty but also made great attempts, in the late 1950-s – early 1960-s, to popularize its activities as a journalist and a scholar._

**_Key words:_** _Technical Drawing, painting, Art Faculty, artistic exhibition, artist teacher, engraving, teacher, student, diploma paper._